Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

Цана асобнага нумару 20 грош.

БЕЛАРУСКАЯ ДОЛЯ

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул. 12, п. 6.** (Wileńska 12, m. 6).

Рэдакцыя адчынена ад **12** да **2** г. штодня апрача сьвяточных дзён. Адміністрацыя ад **9** да **3** г.

Падпіска на адзін **месяц** з дастаўкай да хаты **2 зл.** Для заграніцы ўдвая даражэй.

Перамена адрэса 30 грошы.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не вяртаюцца. Аплата надрукована га залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош., сярод тэксту 20 грош. і на 4 стр. 15 гр., за радок пэтыту ў 1 шп

Выходзіць тры разы ў тыдзень.

№ 2. Вільня, Серада, 14-га студзеня 1925 г. Год I.

Цэнтральн. Белар. Шк. Рада,

жадаючы дапамагчы свайму народу ў дамаганьні сваеі роднаі беларускаі школы, зьвяртаецца да паўнамоцнікаў, вучыцялёў і наагул грамадзянства даць Цэнтр. Бел. Школьн. Радзе наступныя весткі ў справе адчыненьня беларускаі школы, або пераварэньня істнуючаі польскаі школы ў беларускую:

1. Калі быў зроблен прыгавар аб адчыненьні беларускаі школы.
2. Кім зацьверджаны прыгавар (Калі не зацьверджаны, то чаму).
3. Калі і кім быў паданы Інспэктару прыгавар.
4. Які адказ даў, вусны ці пісьменны Інспэктар (паперу ад Інспэктара прыслаць у Раду).
5. Ці адчынена польская школа замест беларускаі.
6. Ці выкладаецца беларуская мова ў польскаі школе.
7. Які вучыцель працуе ў школе — тутэйшы ці з Польшчы (яго імя і прозьвішча).
8. Як вучыцель адносіцца да дзяцей і людкасьці.
9. Прыслаць у Раду паперкі ад Інспэктара аб штрафу і сьпісак аштрафаваных бацькоў.
10. Ці ёсьць прыватная беларуская школа.
11. Якія перашкоды наагул для адчыненьня беларускаі школы.
12. Прыслаць у Раду копіі прыгавараў, калі яшчэ ня высланы.

Прыслаць па адрасу:

Wilno, ul. Wileńska 12—6,
Centralna Białoruska Rada Szkolna.

Цэнтральная Беларуская Школьная Рада.

3—1

Раскол у камуністау.

Ня гледзячы на тое, што ў сучасных дзяржавах Эўропы, дый усяго сьвету наагул, нязвычайна ярка расцьвітае так-званы нацыянальны эгоізм, або імкненьне ўсіх і ўсё падчыніць інтарэсам пануючае ў дзяржаве нацыі,—сусьветнае жыцьцё разьвіваецца ў кірунку рэзка процілежным. Справа ў тым, што эканамічна-гаспадарчае разьвіцьцё народаў і дзяржаў рашуча вымагае не стаўляньня міжы імі „кітайскае сьцяны", не адгараджываньня і падзелу, а *супрацоўніцтва і аб'яднаньня* дзеля супольнага здабываньня магчымасьці жыць і разьвівацца для ўсяе людзкасьці, для ўсіх народаў разам і кожнага асобна.

Ясна, што такое аб'яднаньне, такое братняе супрацоўніцтва народаў сьвету магчыма толькі пастольку, паскольку запануе міжы народамі *роўнасьць і воля*, паскольку *ня будзе сярод іх народаў пануючых і народаў—нявольнікаў*. Але як-раз з гэтым ня могуць ніяк згадзіцца так-званыя „дзяржаўныя народы",—значыць, тыя, што маюць „сваю" дзяржаву, у якой пануюць над „сваімі" меншасьцямі. І вось, уступаючы трэбаваньню жыцьця, гэтыя дзяржаўныя народы стварылі свой саюз—Лігу Народаў, але толькі паняцьце запраўднага саюзу *ўсіх* дзяржаўных і недзяржаўных *народаў* падмянілі паняцьцем саюзу *дзяржаваў*—і то выключаючы народы, пераможныя ў сусьветнай вайне, выключаючы і радавы саюз рэспублік народаў былое Расейскае імпэрыі.

Апошні прадстаўляе спробу зьдзейсьніць ідэю аб'яднаньня не дзяржаў, а іменна *народаў*, завёўшых у сябе радавы лад. Але і там ідзе й па сягоньняшні дзень барацьба паміж дзьвюма ідэалёгіямі: старой расейскай вялікадзяржаўнасьці, якая імкнецца зьвясьці да нуля самастойнасьць нацыянальных рэспублік, і ідэалёгіяй запраўднае самастойнасьці народаў, якія ўваходзяць у склад СССР.

Гэтая барацьба двух ідэйных кірункаў перакінулася з СССР і да камуністаў Польшчы, як аб гэтым сьведчаць „рэвэляцыі" віленскага „Słowa", перадрукаваныя намі ў сёньняшнім нумары. Толькі тут ідэя расейскае вялікадзяржаўнасьці перэтварылася ў ідэю *польскае вялікадзяржаўнасьці*, якая і змагаецца *з беларускай нацыянальнай ідэяй*. Польскія камуністы, як і маскоўскія „вялікадзяржаўнікі", вельмі хораша дэклямуюць аб праве самавызначэньня беларускага народу, абвяшчаюць права ажно на поўнае аддзяленьне Заходняе Беларусі ад Польшчы, але адначасна вядуць выразна *варожую палітычную лінію ў адносінах да нацыянальнага адраджэньня беларускага народу*, ведаючы вельмі добра, што ня можа быць ніякае гутаркі аб нацыянальным самавызначэньні беларусаў, калі яны ня будуць мець *нацыянальнае сьвядомасьці, абапертай на моцных фундамэнтах нацыянальнае культуры*.

Гэтая крывадушнасьць, гэтае фальшаваньне ідэі саюзу *народаў*, перанятае польскімі *камуністамі* ад ярка *буржуазнае* Лігі Народаў, судзячы з заметак „Słowa", і выклікала раскол у камуністычнай партыі Польшчы. Камуністычная партыя Заходняе Беларусі аддзялілася ад варшаўскага цэнтру і заявіла, што не прызнае польскае партыі сваім павадыром, рэзка пратэстуючы аднача́сна проці нацыянальнае палітыкі Варшавы. І гэты голас нацыянальнага сумленьня, загаварыўшага ў беларускіх камуністаў, гэты пратэст проці вялікадзяржаўных імкненьняў польскага камунізму зьяўляецца для апошняга шмат цяжэйшым прысудам, чым усе пратэсты беларускага незалежнага грамадзянства.

Трэба думаць, што цяпер для *польскага* камунізму дарога ў Заходнюю Беларусь будзе зачынена: нацыянальная сьвядомасьць беларускага працоўнага народу настолькі вырасла, што зьяўляецца аднэй з галоўных падставаў усяго палітычнага жыцьця Заходняе Беларусі, і—цераз яе пераскачыць нельга!

Што гэта так, найлепш паказуе гісторыя йшчэ так нядаўна магутных уплываў у Заходняй Беларусі *польскае* партыі „Wyzwolenie" і... поўнае іх ліквідацыі. Як ведама, ў часе выбараў у Сойм і Сэнат „Wyzwolenie" йшло ў беларускую вёску з *беларускімі* нацыянальнымі лёзунгамі (родная школа, ліквідацыя польскага асадніцтва, тэрытарыяльная аўтаномія і т. п.) і гэтым пабіла ўсе канкураваўшыя з ёй польскія партыі, не выключаючы П. П. С. Але за два гады соймавае працы „Wyzwolenie", галасуючы за крэдыты на апалячываньне Зах. Беларусі (польскія школы, польскае асадніцтва), выявіла сваё нацыянальна-польскае аблічча, — і цяпер усе старыя ўплывы гэтае партыі на беларускае сялянства счэзьлі, як дым, разьвеяны ветрам.

Сэнсацыйныя рэвэляцыі.

Барацьба дзьвюх камуністычных партыяў на нашай тэрыторыі.

Пад такім сэнсацыйным загалоўкам віленскае абшарніцкае „Słowo", адзіная, здаецца, польская буржуазная газэта, якая падае інфармацыі аб камуністычным руху ў Заходняй Беларусі, друкуе ў № 7 з 10 студня с. г. ніжэйпісанае:

„Учора мы йзноў атрымалі № 2 „**Большевика**", другога нелегальнага выданьня, якое выходзіць быццам-то ў Вільні.

„Вестка, пушчаная зумысьля ці няўмысна „Праўдай", а за „Праўдай" паўторная намі: быццам **беларускія** бальшавікі лічаць сваім павадыром **польскую** камуністычную партыю,—вельмі ўгнявіла беларускіх камуністаў.

„Прысланы нам нумар „Большевика" прадстаўляе адзін акт абвінавачаньня проці польскіх камуністаў. Усіх пунктаў абвінавачаньня ня будзем паўтараць, але адзначым, што напісаны яны такім стылем, якім камуністы дагэтуль гаварылі толькі аб буржуазных партыях.

„Сярод закідаў знаходзіцца абвінавачаньне, што цэнтральны камітэт польскае камуністычнае партыі падтрымлівае „незалежную хлопскую партыю" п. Воевудзкага, „былага ката польскае дэфэнзывы ў Менску". Беларускія камуністы даводзяць, што п. Воевудзкі вядзе сваю работу, з маўклівае згоды польскіх камуністаў.

„Апрача таго, паводле думкі беларускіх камуністаў, **польскія камуністы пхнуць беларускі люд у баявыя арганізацыі**, кшталтам „Пралетарскае Грамады", „арганізацыі імя Лёніна", „Чырвонае зьвязды" і іншыя. Гэтыя арганізацыі ўносяць хаос у партыйныя адносіны.

„Польская камуністычная партыя, на пагляд яе беларускіх калегаў, не даволі разумее, што **камуністычны рух на абшары Заходняе Беларусі павінен выкарыстываць беларускую нацыянальную сьвядомасьць і супрацоўнічаць з поступам гэтае сьвядомасьці.**

„На падставе чысьленых абвінавачаньняў і закідаў **беларускія камуністы пастанаўляюць ачысьціць ад польскіх камуністаў тэрыторыю Заходняе Беларусі** (Віленшчыну, Наваградчыну і Палесьсе). **Польскім камуністам забараняецца быцьцё на гэтым абшары**, ды нават тыя „таварышы", якія сяньня належаць да беларускае камуністычнае партыі, але нэкалі былі сябрамі польскага камунізму, будуць прымушаны пакінуць рады партыі, да якое прысталі.

„Гэтыя нязвычайна цікаўныя заявы даюць нам паняцьце аб меры, якія сільныя супярэчнасьці істнуюць паміж наадзінокімі групамі камуністаў. Праўда, **супярэчнасьць на нацыянальным грунце — гэта зьявішча зусім зразумелае і толькі на пагляд сэнсацыйнае**".

Свой аб сваім.

(Партрэт Мусоліні).

Італьянская апазіцыйная прэса прыадкрыла ўрэшце заслону над дзейнасьцяй дыктатара Італіі Мусоліні і паказала той „чорны дзядзінец", тыя „задворкі", што цяпер пачалі адкрываць і самі фашысты, якіх Мусоліні, каб улагодзіць апазіцыю, пасадзіў у вастрогі.

Адзін з іх, Цэзарын Росьсі, былы начальнік над усей італьянскай прэсай у габінэце Мусоліні і яго блізкі прыяцель, цяпер сядзіць за справу забойства Маттэотті ў вастрозе. І вось толькі што ён апублікаваў вельмі пікантны „мэмарыял" аб Мусоліні, адрыўкі з якога паявіліся і ў польскай прэсе. Вось, што піша гэты былы прыяцель і супрацоўнік Мусоліні.

Росьсі сцьвярджае, што Мусоліні ня толькі ведаў усё аб падгатоўцы забойства Маттэотті, ня толькі асабіста даваў загады плаціць забойцам,

але быў душой і ўсяго тэрору, усіх забойстваў і замахаў, якімі перапоўнены гэтыя два гады крывавага фашыстаўскага панаваньня.

Але Мусоліні ня толькі арганізаваў ці дазваляў забойствы ў краі: ён яшчэ выпраўляў, як даводзіць Росьсі, цэлыя „карацельныя экспэдыцыі“ заграніцу, каб забіваць там ворагаў фашызму.

Адну з такіх экспэдыцыяў падрабязна апісывае Росьсі.

„Калі ў Парыжу быў забіты фашыст Гэрі, фашыстаўскі пасол Бастіатіні, абгаварыўшы справу з Мусоліні, выслаў у Парыж Думіні (галоўнага забойцу Маттэотті),—Вольні і Рутато (ўсе тры прафэсіянальныя забойцы, бандыты — былі на „дзяржаўнай службе“ ўраду Мусоліні...).

Генарал Дэ- Боно (начальнік фашыстаўскай міліцыі) даў ім усім фальшывыя пашпарты... Фінжі (віцэ-міністар унутраных спраў), у маей прысутнасьці, па загаду Мусоліні, даў ім 10 тысячаў ліраў. Здаецца, толькі-ж было даплачана па іх павароце дамоў“.

Экспэдыцыя трох дзяржаўных бандытаў, меўшая мэтай дасачыць і забіць забойцу фашыста Гэрі, дала пажаданыя вынікі, аб чым Росьсі і далажыў асабіста Мусоліні. „Калі Думіні вярнуўся, лёгка ранены сам, з Парыжу, Мусоліні прыняў яго і сардэчна дзякаваў яму. А „сэкрэтарыят для справаў фашызму заграніцай“ падараваў Думіні портсыгар з яго вэнзалем—на памятку аб слаўным дзеле“...

Росьсі далей вельмі памастацку характэрызуе Мусоліні, як галоўнага кіраўніка ўсіх эксцэсаў, усяго тэрору фашыстаў. Гэтым зусім рассяваецца створаная заграніцай і ў Італіі легенда аб тым, быццам Мусоліні стрымліваў фашыстаўскія зьверствы: наадварот, ён **больш, чым хто іншы, распаліваў гэтага зьвера фашызму!**

Калі ў 1923 годзе пачаў выходзіць у Рыме найбольш крыважадны орган фашыстаў, „Impero“, Мусоліні вельмі лоўка пусьціў чутку, што гэта орган яго ворагаў, справа — „крайніх радыкалаў фашызму“, якіх ён хоча, але пакуль што ня можа, узяць у свае рукі. Але вось Росьсі раскрывае, што найбольш крывавыя і ядавітыя артыкулы, найбольш падбураючы да замахаў і гвалтаў тэрору стацьці пісаў у газэце „Impero“ ніхто іншы, як **сам Мусоліні**. І, як кажа Росьсі, гэтыя артыкулы зусім ня былі паліцэйскім „ходам“ ўрадавай правакацыі, якая хоча, падбурыўшы да праступленьняў, вылавіць праступнікаў, ці пагражаючы ім, трымаць іх у руках... Зусім не! — нават ня гэта! — Гэтыя артыкулы былі выражэньнем неперAможнага „тэмпэрамэнту п. Мусоліні, яго асабістага „клімату“, выражэньнем яго ненавісьці да ворагаў — сацыялістаў і канстытуцыяналістаў...

Калі, напрыклад, па загаду фашыстаўскага цэнтру быў зроблены галосны у свой час замах на пасла Амэндоля, і ген. дэ-Боно далажыў аб гэтым па тэлефону Мусоліні, дык той (—ён праводзіў у той час Каляды сярод сям'і ў Мілане) сьпярша зрабіў від, што сярдуе, а пасьля вызваў ізноў да тэлефону генарала дэ-Боно, каб падзякаваць яму за вестку, бо ад ае — „зьеў сьнеданьне з большым, як звычайна, апэтытам“.

Надзвычайна характэрна кажа Росьсі аб тым, што, даведаўшыся аб гэным нападзе на пасла з газэтаў, ён, як шэф прэсы, затэлефанаваў да генарала дэ-Боно, каб праверыць вестку; і вось з тлумачэньняў фашыстаўскага шэфа паліцыі ён зразумеў, што гэта, як ён вельмі пікантна кажа, — „**дзяржаўны напад**“... Дык зусім слушна кажа „Kur. Polski“, што ў гэтым двух славах — найлепшая характэрыстыка таго рэжыму і таго ўраду, якія пануюць яшчэ ў Італіі: „У Італіі дагэтуль яшчэ робяцца дваякага роду напады і забойствы прыватныя і дзяржаўныя... Дзяржава, якая робіць напады на сваіх уласных грамадзянаў!... — вось „państwo“ Мусоліні!“.

Але характарыстыка італьянскага дыктатара— яшчэ ў гэтым няпоўная..—Росьсі дадае яшчэ „чалавечыя“ рысы да гэтага партрэту зьвера...

Мусоліні больш за ўсіх і за усё на сьвеце ненавідзіць і баіцца... свайго праціўніка і канкурэнта—„князя фіумскага“, д'Аннунцыо,—знамянітага італьянскага пісьменьніка раманіста. Мусоліні перамог д'Аннунцыо, які, праўду кажучы, першы пачаў рабіць „фашызм“, але аказаўся для запраўднага „дзеда“ лішне „літэратарам“...

Але ўсё-ж Мусоліні ненавідзіць Аннунцыо і завідуе яму, бо чуе перавагу яго інтэлекту, таленту, прыгожасьці...

І вось што расказывае Росьсі:

„Памятаю, аднага дня раніцай, прачытаўшы перахвачаную тэлеграму (вось, чым займаецца ў Італіі прэм'ер габітэту!) нейкай сям'і з Крэмоны з выражэньнем пашаны і захопленьня да знамянітага паэта (Аннунцыо), Мусоліні ўскаччу і зараз-жа затэлефанаваў да аднаго з шэфаў фашыстаўскай „міліцыі“, каб ён загадаў... **пабіць** аўтараў тэлеграмы і прымусам **напаіць іх усіх** — усю сям'ю пачытацеляў д'Аннунцыо—рыцынай...

Вось, што значыць дыктатарская ўлада Італіі. Вось, якая рука ўсё-ж яшчэ правіць Італіяй і душыць у ёй народ. Вось, чыю руку з гэткім захопленьнем сьціскаў „наш“ віцэ-прэм'ер п. Тугутт..

Кажуць,—апазіцыя пераможа Мусоліні... Дык ці трэба яго перамагаць ворагам, калі яго дабіў ужо да сьмерці **свой**—яго былы прыяцель і супрацоўнік? Што-б ён ні рабіў яшчэ, ён забіты ўжо і ня ўстане. Бо ці-ж адважыцца хто з шануючых сябе прэм'ераў Эўропы сьціснуць на якой канфэрэнцыі ці пры простым спатканьні руку п. Мусоліні?!.

М.

Палітычны агляд.

У Польшчы.

Справа канфлікту з Гданскам.

Як высьняецца з гданскіх газэт, абурэньне няпольскага насяленьня і ўраду Гданска выклікана было тым, што польскі камісарыят павесіў у Гданску, побач з скрынкамі да пісем дзяржаўнай пошты Вольнага Места—свае скрынкі з польскім дзяржаўным гэрбам—белым арлом. Нямецкая прэса з гэтае прычыны падняла трывогу, бачучы ў гэтым правакацыю, замах на сувэрэннасьць Вольнага Места і імкненьне да яго апалячаньня. Усе гэтыя арлы і былі замаляваны па загаду Сэнату—яго ўрадоўцамі.—Разьбівалі-ж скрынкі—нямецкія „ахвотнікі“...

У адказ на другую ноту польскага камісара Гданскі Сэнат паўтарыў у больш выразнай форме свой пагляд на праўнае палажэньне польскай пошты ў Гданску.

На гэтую ноту п. Страсбургер не адказаў нічога, а меўся паехаць у Варшаву, каб далажыць аб усім інцыдэнце польскаму ўраду.

Зьліквідаваньне канфлікту.

Як паведамляюць польскія газэты, 9 вечарам да мін. Страсбургера зьявіўся прадстаўнік гданскага сэнату і заявіў ад імя прэзыдэнта апошняга, што сэнат, ідучы за радай Высокага Камісара (Лігі Народаў) на м. Гданск, бязумоўна асуджае псаваньне дзяржаўнай уласнасьці Польшчы на тэрыторыі Вольнага Места Гданску і выражае Польскаму Камісару свой жаль.

Гэткім чынам трэба лічыць увесь канфлікт уладжаным.

Няведама толькі пакуль-што, за што іменна перапрашаў прэзыдэнт сэнату польскага міністра і ці зьмяніў сэнат свой прынцыповы пагляд на прадмет спрэчкі.

Спробы стварэньня новае большасьці.

У соймавых кругах гавораць аб новых спробах стварэньня ў Сойме моцнай цэнтральнай групы, якая зьявілася-б падставай для парляманцкай большасьці і новай урадавай камбінацыі.

Пачын усей акцыі ўзялі на сябе паслы Корфанты і Ратай,—значыць, ядром новай большасьці будуць клюбы хадэкаў і пястоўцаў („вітасоўцаў“).

„Wszędzie Thugutt“.

„Dz. Wil.“ абураецца:

„10 студня адбылася канфэрэнцыя прадстаўнікоў прэсы ў справе канфлікту з Гданскам, скліканая мін. Тугуттам“.

„Wszędzie Thugutt“,—wszędzie,—дзе трэба прамаўляць, канфэраваць і... ня трэба рабіць...

Ці не казаў на гэтай канфэрэнцыі, здаючы экзамен перад п. п. Сэйдам і Дмоўскім, таксама чагось аб „карабінах, якія павінны добра страляць“?..

Лекцыя марш. Пілсудскага ў Варшаве.

Марш. Пілсудскі маніцца прачытаць ў Варшаве лекцыю аб арганізацыі найвышэйшых ваенных уладаў у Польшчы, у якой мае, як піша “Kur. Polski“, паінфармаваць „o swoich zamiarach“ (?) на найбліжэйшую будучыню (?).

Лекцыя абяцуе быць сэнсацыйнай, бо ў свой час газэты падавалі, у якіх „моцных“ выражэньнях крытыкаваў м. Пілсудскі праект міністра Сікорскага, які „наперад робіць „błaznem“ у вачах народу таго, хто ў выпадку вайны мае быць вярхоўным правадыром арміі“...

Вайна „пілсудчыкаў“ і „сікоршчыкаў“ разгарыцца ізноў...

Дывэрсыйныя банды на граніцы.

З Корца, на Валыншчыне, паведамляюць, што на польска-радавай граніцы ізноў зьявіліся 3 дывэрсыйныя банды, налічываючыя да 800 душ. Улады прынялі меры, каб перашкодзіць ім перайсьці граніцу.

Заграніцай.

На канфэрэнцыі міністраў фінансаў у Парыжу.

На першым паседжаньні канфэрэнцыі міністраў фінансаў, у справе падзелу нямецкіх адшкадаваньняў першую прывітальную прамову сказаў францускі міністар Клемантэль, які, паміж іншым, сьцьвердзіў, што Нямеччына пунктуальна споўніла ўсе свае забавязаньні, выплываючыя з „пляну Доўса“. Канфэрэнцыя мае мэтай аканчальна ўстанавіць нормы падзелу адшкадаваньняў, якія толькі тымчасова дзяліла Камісія Адшкадаваньняў. Міністар верыць, што ў Парыжу, як і ў Лёндане ўлетку, будзе дасягнута агульнае паразуменьне.

Прадстаўніку Францыі адказаў ад імя ўсіх калегаў англійскі міністар Чэрчыль.

Ён адзначыў, што на канфэрэнцыю сабраліся ўсе прыяцелі (па абдзіраньні немцаў), і што найважнейшым рэзультатам канфэрэнцыі будзе яшчэ большая прыязьнь усіх канфэруючых у Парыжу ўрадаў.

Прадстаўнік Амэрыкі (якая, ня спухаючы пратэстаў Англіі, рашуча заявіла і свае правы на нямецкія адшкадаваньні, хаця і не ратыфікавала Вэрсальскага

„Кроу на банкеце“.

Пад гэткім загалоўкам у радыкальным польскім тыднёвіку „Jutro“ (які мае за сабой заслугу **адзінага ў Польшчы органу прэсы**, што галосна і шчыра высказаў сваё маральнае абурэньне, з прычыны таго „flirtu na grubo“, які вядзе польскі ўрад з „грамадзянамі“ вясёлага дома п. Валэйшы на Людвісарскай) зьмешчана заметка аб знамянітай прамове п. міністра Тугутта на банкеце ў Вільні.

Падаем з яе некаторыя адрыўкі:

„П. Станіслаў Тугутт для апрацаваньня праграмы сваей палітыкі на ўсходзе паехаў у Вільню.

Там п. дэлегат ураду Рачкевіч... зрабіў банкет, на які запрасіў прадстаўнікоў усіх кругоў грамадзянства, з выключэньнем толькі запраўдных прадстаўнікоў нацыянальных меншасьцяў; гэтыя апошнія для дасьледу п. Тугутта зусім ня былі патрэбны, бо аб іх якраз ішла ўся справа... — П. Тугутт, як добра выхаваны, ведае, што аб прысутных не гаворыцца... П. Тугутт... сказаў прамову. І вось у гэтай прамове, чуючы ў сабе цудатворную моц, атрыманую калісь у Рыме, дзе ён сьціскаў руку Мусоліні, п. Тугутт сказаў знамянітыя словы аб тым, што паліцэйскія карабіны на „Крэсах“ павінны страляць добра, і што ў сваей „санацыйнай“ акцыі ён мае абаперціся на (адзіных „здаровых“ элемэнтах на „Крэсах“)—абшарніках і асадніках...

„Пан пасол Тугутт, які ў часе выбараў гаварыў ультра-рэвалюцыйныя прамовы з запалам і навытараньнем прафэсіянальнага рэвалюцыянера, зьмяніў на банкеце віно ў кроў...

„Чым больш лілося на банкеце віна, тым прамова п. міністра рабілася чырванейшай ад крыві, якую, добра і метка страляючы, паліцэйскія карабіны маюць праліць на „Крэсах“ — пад багаслаўленьнем п. Тугутта...

„Як-жа характэрным зьяўляецца казаньне падобных прамоваў... Польскі працоўны народ, а перад усім сялянскае насяленьне „Крэсаў“ (беларусы!..), якія аддалі сваі галасы і свой лёс у рукі п. Тугутта і яго таварышоў з „Wyzwalenia“, напэўна, не забудуць ніколі п. Тугутту гэтых „добрых паліцэйскіх карабінаў“ і—ўсей яго палітыкі, ня менш „стралючай“ (strzelistej), толькі таксама—ня ўмеючай ніяк папасьці ў цэль...

„Дык вось, пакуль-што, трэба сказаць адно: „добрыя паліцэйскія карабіны“ вельмі лёгка купляюцца (асабліва ў крэдыт...), і страляць з іх метка па банкетах вельмі проста... Але на месцы і на дзеле гэтае аружжа—вельмі небясьпечнае, бо ў вагні бою пераходзіць з рук слабейшага ў рукі дужэйшага...

„А яшчэ вялікае пытаньне, — хто акажацца дужэйшым: ці п. Тугутт, папіханы габінэтам міністраў, разам з радам спагадаючых яму палітыкаў, ці—народ, папіханы бядой і гвалтам“...

Як ведама, найлепшыя і найшляхотнейшыя цыцэроны робяцца заўсёды з „nawróconych“... на міністэрскія крэслы Катылінаў... Дык ня дзіва, што захопліваючыся, сеўшы на міністэрскім крэсьле, паліцэйскімі вінтоўкамі, яны фатальна перастаюць разумець тую страшэнную сілу — „папіханага бядой і ўціскам народу“, якой яны-ж самі, у ролі Катылінаў, пужалі ўладу і здабывалі сабе на выбарах даверые і мандаты народу...

Трактату, аб чым ёй напамінае Англія), высказаў перакананьне, што праца канфэрэнцыі дасьць пажаданыя вынікі.

Пасьля прадстаунікі Італіі і Японіі далучыліся да прамоваў папярэдніх аратараў.

Аднак, нямецкія газэты пішуць, што на Парыжскай Канфэрэнцыі ня могуць дайсьці да згоды.

Перад усім Амэрыка адмаўляецца прыватна размаўляць аб урэгуляваньні на канфэрэнцыі справы міжсаюзных даўгоў.

Францыя і Бэльгія вельмі нездаволены Англіяй, з прычыны паразуменьня яе з Амэрыкай — коштам рэшты эўрапэйскіх саюзьнікаў.

Дзіва, што паразумеліся: яны-ж абедзьве — крэдытары, а рэшта ўсё—даўжнікі.

Адстаўка Троцкага.

Польскія газэты паведамляюць, быццам з Масквы дайшла вестка аб тым, што Троцкі аканчальна пакінуў становішча ваеннага камісара і старшыні Ваенна-Рэвалюцыйнае Рады.

Чычэрын аб „лісьце Зіноўева“.

У новай гутарцы з прадстаўнікамі прэсы, Чычэрын, паміж іншым, закрануў справу спору свайго з міністрам заграгічных спраў, Чэмбэрленам, аб так зв. „лісьце Зіноўева“. Вельмі спрытна ён пярэчыць англійскаму міністру, даводзячы, што той, хто адмаўляецца, як Чэмбэрлен, ад разьемчага суда, ня мае права казаць, што яго пагляд — правільны. З другога боку, — англійскі ўрад павінен ясна і точна сказаць, як і праз каго ён атрымаў „запраўдны ліст Зіноўева“, бо толькі тады радавы ўрад, ведаючы гэтую крыніцу агітацыі Комінтэрну ў Англіі, здолее спыніць яе. Сам радавы ўрад ня мае запраўднага лісту Зіноўева і дзеля таго ня можа прыняць ніякіх мераў, каб пакараць вінавайцаў. — Хто мае яго, як англійскі ўрад, той і павінен — супольна з радавым — высьвятліць той шлях, якім гэты ліст папаў у Лёндон—у рукі Мак-Дональда.

Заява Чэмбэрлена, што запраўднасьць лісту пацьвярджаюць аж 3 крыніцы,—нічога не даказвае: англійскі ўрад можа мець ня толькі 3-х, але і 300 правакатараў, якія будуць сьведчыць, аб чым толькі ім зага-

даюць. Дык вось, калі англійскі ўрад адмаўляецца юрыдычна — бесстаронным шляхам — палюбоўным судом — высьветліць усю справу, дык яго абвіненьне павінна разглядацца толькі, як тактычны манэвр, які зьяўляецца адным з спосабаў агульнай антырадавай палітыкі сучаснага англійскага ўраду..

„Роста“ аб Манголіі.

„Роста“ пярэчыць весткам эўрапэйскай прэсы аб далучэньні Манголіі, як Радавай Рэспублікі, да ССРР. Весткі гэныя маюць мэтай дыскрэдытаваньне радавай палітыкі ў Кітаі. Манголія — толькі прыязная да ССРР народная, але **ня радавая** рэспубліка, якая прызнаець сувэрэннасьць (вярхоўную дзяржаўную ўладу) Кітаю. Яе адносіны да Кітаю будуць дэтальна апрацаваны на будучай канфэрэнцыі.

Румынія пасягае на „флёт ген. Врангеля“.

Румынія заявіла францускаму ураду свае прэтэнсіі на „флёт ген. Врангеля“, які стаіць яшчэ ў порце Бізэрта і які Францыя згадзілася вярнуць ССРР.

Румынія хоча гэты флёт узяць за свой залаты фонд, што ў часе заняцьця немцамі яе тэрыторыі быў вывезены ў Маскву і з Масквы ўжо не вярнуўся ў Румынію.

Мабілізацыя афіцэраў арміі Врангеля.

Гданская прэса паведамляе, што афіцэры арміі Врангеля, якія жывуць у Гданску, атрымалі загад „цара Кірыла“ — неадкладна выехаць у Баўгарыю ў распараджэньне штабу ген. Врангеля.

Рэпрэсіі проці камуністаў у Літве.

„ПАТ“ даносіць, што ў Коўні і на правінцыі ў Літве арыштавана шмат камуністаў. Знойдзена шмат літэратуры. На апошняй сэсіі суда 4 камуністы засуджаны на расстрэл. Прысуд выкананы.

Старшыня нямецкага парляманту.

7-га студзеня адбыліся выбары старшыні Рэйхстагу.

Большасьцю 231 галасоў выбраны старшыня папярэдняга парляманту, сацыял-дэмакрат Лебэ. Кандыдат нацыяналістаў Вальраф атрымаў толькі 102 галасы; кандыдат „людоўцаў Штрэзэмана“, Кардоф — 59.

З гэтага галасаваньня відаць, што „цэнтра-правая большасьць“ ня мае ніякіх шансаў у Рэйхстагу.

Няўдача канцлера Маркса.

З Бэрліну паведамляюць, быццам Маркс адмовіўся ад місіі злажыць габінэт.

Новы кандыдат у прэм'еры.

З прычыны адмовы канцлера Маркса ад стварэньня ўраду, высоўваецца для гэтай місіі беспартыйны дохтар Лютэр, які па сваім сымпатыям падыходзіць бліжэй усяго да правага крыла нямецкіх людоўцаў. Органы сацыял-дэмакратаў і дэмакратаў заяўляюць, што іх партыі будуць пры гэткім урадзе ў апазіцыі.

Фальшывая вестка аб забойстве Мусоліні.

Францускае тэлеграфнае агенцтва сьцьвярджае фальшывасьць пушчанай з Вены ці з Бэрліну (?) весткі аб тым, быццам на Мусоліні зроблены быў замах, у выніку якога прэм'ер быццам быў забіты...

Апошняя хваля тэрору ў Італіі.

На апошнім паседжаньні рады міністраў, міністар унутраных спраў далажыў, што, па яго загаду, у апошнія дні зачынены 95 западозраных (у апазіцыйнасьці) клюбаў, 25 рэвалюцыйных (?) арганізацыяў, 150 прытулкаў (?). Апроч таго, зачынены 120 сэкцыяў таварыства „Вольная Італія“, зроблена 650 обыскаў і арыштаваны... 11 небясьпечных асобаў... Прэфэктам (старостам) дадзены паўнамоцтвы адбіраць дазволы на аружжа (ад усіх, апрача фашыстаў?). Дадзены загады ўзмоцніць ахову чыгункавых лініяў.

Міністар справядлівасьці (фашыстаўскай...) далажыў, што ў яго ўжо гатоў... новы ўгалоўны статут, які трэба якнайхутчэй „правясьці“...

У Мілане зачынены рэспубліканскі клюб.

Скліканьне „парляманту“.

Рада міністраў пастанавіла склікаць на 12 студня фашыстаўскі „парлямант“.

Зьмена тактыкі апазіцыі.

Сярод апазіцыі йдуць спрэчкі ў справе зьмены тактыкі: адна частка стаіць на тым, каб прадаўжаць байкот „парляманту“, другая — каб ісьці ў яго дзеля галоснага кампрамітаваньня ў ім улады Мусоліні.

7 студня адбываліся нарады паміж людоўцамі і сацыялістамі аб утварэньні коаліцыі (супольнага фронту). Джолітті запрапанавалі стануць на чале апазіцыі. Ен згадзіўся, але паставіў варункам, каб ня толькі ісьці ў парлямант, але ісьці ў ліку ня менш 150 дэпутатаў. Калі-б уся апазіцыя пайшла супольным фронтам проці фашыстаў, дык мела-б у парляманце магутную групу, лікам 191 дэпутат.

Рэпрэсіі ў Харватыі.

Арышты сярод харвацкіх сялянскіх дзеячоў прадаўжаюцца: у Себевіко арыштаваны 30 харвацкіх сялян.

Да „лядзінскае“ справы.

Мы ўжо пісалі аб выступленьні дэпутата Ярэміча ў абарону сялян вёскі Лядзіна, Слонімскага павету, з якіх гвалтам спаганяюць штрафы за непасылку дзяцей у польскую школу, руйнуючы пры гэтым сялянскія гаспадаркі. Падавалі мы і зьмест тэлеграмы п. Тугутта, які паведамляў дэп. Ярэміча аб спыненьні спагону штрафаў, — чаго, на жаль, слонімская адміністрацыя не паслухала. Цяпер падаем зьмест жалабы пацярпеўшых сялян в. Лядзіна, прысланае ў Цэнтральную Беларускую Школьную Раду ў Вільні:

ЗАЯВА.

Мы, грамадзяне вёскі Лядзін, даведаўшыся аб языковых законах, 10-га кастрычніка 1924 г. на агульным сходзе ўхвалілі пературыць польскую паўшэхную школу ў сваю родную беларускую, а да мамэнту яе пературэньня сталі вучыць сваіх дзетак на свой кошт у беларускай мове; тады інспэктар прыслаў на нас кару па 15 злот. або па 5 дзён арышту за непасыланьне дзяцей у польскую школу, ня гледзячы на тое, нашы дзеці вучацца, і аб гэтым заяўлена інспэктару два разы. А калі прыйшлі павесткі аб штрафе, дык солтыс вялеў ісьці ў гміну па гэныя павесткі, мы й выпаўнілі. Каго ня было дома на той час і маткі—ўдовы не маглі явіцца на кліч солтыса, дык другі раз паліцыя позна вечарам а гадзіне 10-й, а мо' і 11-й рабіла паляваньне на нас і гвалтам гнала ў гміну па павесткі аб штрафе (гміна $3^1/_2$ вярсты, і ноч была цёмная). Гміна арышту ня трэбуе, а 13-га сьнежня прыехала разам з паліцыяй яўнай і тайнай забіраць нашае бядачае дабро:

1) У Аляксандры Марчук солтыс садраў кажух з плячэй і забраў калаўродак ад прадзіва, кажух назаўтра вярнулі.

2) У Андрэя Жагаліка боты, якія назаўтра вярнулі.

3) У Андрэя Цімашка два калаўродкі, але бабы адабралі, бо яго дачце пара замуж, а ня ў школу.

4) У Якуба Галубца: калаўродак, пілу і каптан, каптар вярнулі.

5) У Тэклі Жагалік калаўродак.

6) У Алены Курман—палажаніцы войт вырываў падушку з пад-галавы, але ўсе ў хаце нарабілі крыку, дык кінуў рваць і больш нічога ня ўзялі, бо ўсё было пад замком.

7) У Антосі Курман войт маткі ніцей адбіраў, але баба білася і крычала, дык пакінуў.

У гэты-ж дзень са староства з Слоніма прыяжджаў рэфэрэнт і разам з паліцыяй дапрашваў вучыцельку, на якіх варунках школа істнуе і ад якой даты.

Пасьля яны затрымаліся ў вучыцеля, клікалі да сябе прадстаўнікоў грамады, дапытваліся ў іх аб усім і аднаго вучня, сына прадстаўніка, Мікалая Курмана, дапытваліся, што гаварыла вучыцелька ў школе пад час спагону штрафу. Гэтым справа закончылася. Ад'яжджаючы, пагразілі ізноў прыехаць, бо маюць на гэта падставу: другі штраф прыйшоў па 10 зл., а арышту няма.

І вось 27 сьнежня, а гадзіне 12 дня другі раз рабілі набег. Гэты раз:

1) У Якуба Сайчыка ўзялі калёсы-перадок.

2) У Нестара Жагаліка—6 пудоў ячменю.

3) У Паўлюка Жагаліка—калёсы-задок.

4) У Васіля Курмана—цэлыя калёсы,

5) У Пятрука Якоўчыка—6 пудоў аўса.

6) У Паўліны Юргель—цялушку, але назаўтра вярнулі пад залог ваза сена.

7) У Алесі Клокк—цялушку, хацелі ўзяць сячкарню, але ўсе напалі ня даць, дык затое атрымалі пабояў, а Алесю жандар Мондры моцна душыў за горла.

8) У Аляксандра Пацынкі—цэлые калёсы ўзялі.

9) У Юзіка Камара—вяроўку. Бралі-б мо' яшчэ і болей, толькі ў-ва многіх было замкнёна, дык нават пазывалі каваля каб ламаў замкі, але каваль адмовіўся.

Дзіўна! чаму няма кары на солтыса, яго сынок ходзе ў беларускую школу і няма кары на шваґра пісаравага? За гэты час, як у нас школа істнуе, мы былі з вучыцелькай у інспэктара, інспэктара ня было дома, сэкратарка сказала „na próżno te kłopoty, bo tu przecież dziad i pradziad byli polacy. Другі раз былі, дык інспэктар сказаў, што ня можа зьняць кары, бо ня мае на гэта падставы. Вучыцелька была ў п. старосты, але і ён сказаў, што воевудзтво прыказала, „ściągnąć sztraf“, а вучыцелька пойдзе пад суд.

ХРОНІКА.

Што гэта знача? У папярэднім нумары нашае газэты мы зьмясьцілі тэкст тэлеграмы віцэ-прэм'ера Тугутта да дэпутата Ярэміча, што міністэрства загадала тэлеграфна спыніць спагон штрафаў за непасылку дзяцей у польскія школы ў тых вёсках Слонімшчыны, дзе народ саматугам паадкрываў свае ўласныя беларускія школы. Тэлеграма п. Тугутта была з **7-га студзеня**. — Тымчасам мы атрымалі з Слонімшчыны новае паведамленьне, што 9-га студзеня тамака адбыліся новыя налёты на сялянскую маемасьць. Забіралі палатно, збожжа, хатнія рэчы, калаўроты і інш. Усё гэта звалена ў такім месцы, дзе дабро нішчыцца ад вільгаці і вады.

Што-ж гэта значыць? Няўжо-ж самаволя нашае „крэсавае“ адміністрацыі не прызнае выразных прыказаў нават сваіх-жа польскіх міністраў?

Каму робяцца падаткавыя палёгкі. Міністэрства фінансаў (скарбу) пісьмом з 2 студня с. г. за № D.P.O. 2290/IV загадала „скарбовым ізбам“ у Вільні, Бярэсьці і Луцку, каб просьбы аб падатковыя палёгкі, падаваныя **вялікшымі земляўласьнікамі, асаднікамі і малазямельнымі, спаленымі, абрабаванымі або зруйнаванымі дывэрсыйнымі бандамі**, прыймаліся з **прыхільнасьцяй** і ўраз-жа былі разгледжаны, ці то перасланы ў міністэрства, калі просьбы аб палёгкі перавышаюць правы „скарбовых ізбаў“.

Ну, а як-жа будзе з сялянствам наагул, калі яно **не малазямельнае**? Цікава, чаму для іх нямашака ў такіх выпадках палягчэньня,—пад той час, як абшарнікі і асаднікі маюць на гэта права?..

Валэйша ўжо непатрэбен! Гэтымі днямі на валэйшаўскую шулерню („Грамадзянскае Сабраньне“), якая ад таго лета адкрыта завяла ў сябе газардовую ігру, паліцыя зрабіла „налёт“, шукаючы таго, што бачыў увесь горад і аб чым ведалі ўсе, пачынаючы ад іграўшае ў шулерні паліцыі...

Ведама,—тое, чаго шукалі, знайшлі.

Як відаць, валэйшаўская банда ўжо перастала быць патрэбнай, асабліва пасьля правалу ўсяе „кумпаніі“ (Валэйшы, Паўлюкевіча, Косьцевіча і інш.) на зьезьдзе вучыцялёў, вынесшым, ня гледзячы на „зьвінячыя“ ўплывы гэных паноў, „крамольныя“ дамаганьні роднае школы.

Ізноў арышты сярод паліцыі. Як „працуе“ дзеля карысьці места Вільні паліцыя, на якую йдуць з мястовае касы вялізарныя грошы, паказуюць лішне ўжо частыя арышты за „службовыя надужыцьці“. Мы йшчэ не забыліся аб арышце двух вышэйшых паліцэйскіх агентаў у сувязі з абабраньнем нейкіх багатых жыдоў, прыехаўшых з ССРР, ды аб уцёках камісара Янкоўскага ў Літву, — а вось „Słowo“ ў нядзельным нумары піша аб новых арыштах,—гэтым разам ажно трох паліцыянтаў 1-га камісарыяту м. Вільні за службовыя надужыцьці...

Вось вынікі аслаўленае „крэсавае“ палітыкі: бо-ж, як ведама, да нас з Польшчы „сплаўляюць“, быццам на Сахалін, усіх праштрафіўшыхся дома ўрадоўцаў!

Пісьмо у Рэдакцыю.

Паважаны Грам. Рэдактар!

Прашу ласкава зьмясьціць у Вашай газэце ніжэйпаданае.

Ужо трэці год, як я зусім адышла ад бел. палітычнага жыцьця і стала на шлях **выключна** культурна-нацыянальнай дзеяльнасьці. З прыездам у Латвію летам 1922 г. я праз увесь гэты час была адорвана ад Бел. Партыі С.-Р., да якой належала, і не прынімала ў ёй ніякага чыннага ўдзелу.

Вось дзеля чаго, ня могучы прыняць на сябе адказнасьці за дзеяльнасьць Б. П. С.-Р. і жадаючы ў будучыне працаваць на чыста культурна-нацыянальным грунце, — я выходжу з ліку сяброў Б. П. С.-Р., аб чым адначасна апавяшчаю Ц. К. Партыі і беларускае грамадзянства.

Пауліна Мядзёлка.

15. XII. 24.
Дзьвінск.

Да сяброу Т-ва Беларускае Школы.

Цэнтральная Беларуская Школьная Рада просіць сяброў Таварыства Беларускае Школы аб узносе сяброўскіх складак за бягучы адрахунковы год, гэта знача ад 1-га лістапада 1924 г да 1-га лістапада 1925 г. Дзеля збору складак будзе пасланы на кватэру сяброў асобны чалавек з адпаведным упаўнаважаньнем і сьпісам сяброў.

Цэнтральная Беларуская Школьная Рада.

2—1

З жыцьця Горадні.

Беларускі працэс 72 у Горадні. У хуткім часе ў лютым г. г. мае адбыцца ў Горадні палітычны працэс 72 беларусаў, якіх абвінавачваюць у ўтварэньні арганізацыі, якая мела на мэце адарваньне Заходняй Беларусі ад Польшчы.

З 72 падсудных 30 асоб на волі, а 47 у турме, з якіх 5 ужо памёрла. Сядзяць яны з ліпня 1922 году, г. ё. ужо $2^1/_2$ гады.

Сьведак з боку абвінавачаньня 49, у ліку якіх ёсьць уславіўшыяся на Беластоцкім працэсе „45 беларусаў“ — Ленкевіч, капітан Ярэцкі, вядомы ў Горадні вывядоўца Ліс і другія вывядоўцы і паліцыянты. З боку абароны мае быць да 250 сьведак.

Няўдача валэйшаўскае „Прасьветы“. „Актывіст“ Шурпа, вярнуўшыся з валэйшаўскага „вучыцельскага зьезду“ ў Вільні, на якім выкрылася дэфэнзыўная служба Шурпы, пробаваў залажыць аддзел „Прасьветы“ ў Горадні, але шануючыя сябе людзі адмовіліся ад яго прапазіцыяй

Растрата грамадзкіх грошы. 2. I. 25 г. заарыштаваны ў Горадні вядомы калісь-то „актывіст" Міткевіч за растрату 1,117 зл. 50 гр. з грошаў беларуск. прытулку ў Горадні і былая кіраўніца прытулку Аўгеньня Палуйчык за растрату 250 злотых з тых-жа грошаў.

Гэтую растрату выкрыла Рэвізыйная Камісія Бел. Дабрач. Т-ва ў Горадні.

На новых выбарах Старшынёю Камітэту гэтага Т-ва абраны грамадзянін Новік.

Карэспандэнцыі.

Школьныя справы.

(З Слонімшчыны).

У вёсцы Прудах, Дзяравенскае гміны, яшчэ ў м-цы кастрычніку 24 г. наша грамада напісала прыгавар аб адчыненьні пачатковае школы ў матчынай мове, апіраючыся на языков. законы (У нашай вёсцы школкі ня было ніякае ад пачатку сусьветнае вайны). Прыгавар паслалі Шк. Інспэктару, Кожану, у Слонім. Інспэктар нам нічога не адказаў на наш прыгавар, а прыслаў польскага вучыцеля ў нашу вёску, які і адчыніў панскую школку. Мы сваіх дзяцей ня пусьцілі ў польскую школку, бо гэтакае і не прасілі ў інспэктара, нанялі вучыцеля Осіпа Ракевіча на свой кошт і сталі вучыць сваіх дзетак прыватна ў мове матчынай, лёгка зразумелай нашым дзеткам. Даведаўшыся аб істнаваньні гэтакае школкі, гмінная паліцыя наляцела, як каршун на куранё, і разагнала нашу школу. 24 сьнежня ўжо другі раз напісалі прыгавар і паслалі Шк. Інспэктару, а гэтым часам сталі вучыць прыватно і ў сваей роднай мове, наняўшы вучыцельку Надзею Капітанчык, якая мая пасьведчаньне Віл. Бел. Шк. Рады. І на гэты раз паліцыя прыехала разганяць нашых дзетак. Камандант Дзяравенскага пастарунку надта трымаў сябе „папанску", лаючыся пры дзетках, ды нават біў іх. Учуўшы крыкі ў школе, бацькі прыбеглі ратаваць дзетак. Камандант пачаў адракацца, кажучы, што хлопчык, праходзячы каля стала, дзе ён пісаў, закрануў у руку і разьліў атрамант, ды гэтае здарэньне запісаў у пратаколе і вялеў вучыцельцы падпісацца; але вучыцелька адмовілася і сказала, што тагды падпіша, як будзе сказана, што біў і разганяў дзяцей, лаючы і вучыцельку.

Грамада напісала скаргу аб гэтым здарэньні Слонімскаму старасьце. Гэтым часам, школьны інспэктар ужо прыслаў штраф за непасыланьне дзяцей нашых у польскую школку, а польскі вучыцель — галічанін нічога не робіць толькі, што ходзіць па вёсцы ды, пасьмейваючыся, страшыць людзей, што астатнія кароўкі забяруць.

Прудзянін.

„Вялікі выпадак".

(З Косаўшчыны).

У вёску Яглевічы 7. XII. 24 прыйшоў вывядоўца Стэфан Зыбайла, (кабач), пастаянны жыхар вёскі Галенчыц, былы дабраволец, услаўлены грубіянствам і ашуканскімі штукамі. Прыйшоў ён з думкай апахмяліцца, але сваіх грошаў ня меў, дык уздумаў апахмяліцца за жыдоўскія грошы. Забегшыся ў хату жыдоўкі Гаадэ Макрынскай, стаў яе лагодзіць, кажучы: „дай мне 20 злотых, то я табе дам расьпіску на вольны гандаль". Але жыдоўка ня дурная, адказала катэгарычна: „ня трэба твая расьпіска, і 20 злотых ня дам" — ды, з дапамогай другіх жыхароў, удалося ёй выгнаць гэтага вывядоўца вон на вуліцу.

Доўга ня думаючы, вывядоўца пайшоў да другой жыдоўкі — Рыўцы Рубаха; раптоўна ўбег у хату і ўскрычаў: „Ręce do góry", ды пачаў рабіць вобыск, але нічога не знайшоў; дзеля гэтага стаў грозіць рэвальвэрам, дай кажа: „10 зл., а то я цябе зараз застрэлю!"

Перепалоханыя жыдоўка і дзеці выскачылі на вуліцу з крыкам: „Гвалт ратуйце!". Раптам зьбеглася многа людзей і абаранілі жыдоўку.

Вывядоўца бачыць, што дзело кепскае, нічога не дастаў, ды раптам убачыў на вакне пляшку з алеем і захацеў яе забраць. Жыхар вышэйпамяненай вёскі, Барыс Быска, ня мог вытрываць гэтае агіды: схапіўшы сышчыка за каўнер, паваліў яго на зямлю і патрапаў так, ажно пайшла кроў з носа і з рота.

Ачухаўшыся, вывядоўца пабег да солтыса, каб даў яму падводу даехаць да пастарунку. Солтыс паслаў вывядоўца да яго роднага дзеда; а дзед, замест падводы, даў некалькі добрых назапатыльнікаў. Пачухаў патыліцу і пашоў пехатой на скаргу да пастарунку, але і тут не знайшоў сабе прыхыльнікаў. Камандант казаў: „мала ты дастаў". **Праксэда Кучукова.**

Палітычныя вязьні у Горадзенскім вастрозе.

Нам прыслана жменя фактаў, якія характэрызуюць жыцьцё палітычных вязьняў у Горадзенскім вастрозе:

1) 23-га ліпня 1924 г. прыйшоў у вастрожную канцэлярыю камандант паліцыі м. Горадні і дапрашываў Яна Валентуковіча аб пабіцьці яго пры арышце. Валентуковіч падаў двух сьведкаў, якія бачылі, як яго білі: П. Адаменю і Мік. Сяргейчыка.

Сьведкі сцьвердзілі пабіцьцё, якое самі бачылі. У суязі з гэтым іх узялі і перавялі з агульнае камэры ў адзіночку на $1^1/_2$ месяца.

2) У вастрозе ёсьць майстроўня пудэлак, якія робяцца вязьнямі для папіросаў был. хфабрыкі Шэрэшэўскага.

Працуе ад 150 да 200 вязьняў у двух камэрах і там-жа вараць клей.

Дух тамака вельмі цяжкі, і няма чым дышаць; але-ж гэтага яшчэ мала: бо, калі вязьні канчаюць работу, дык усіх іх выводзяць на карыдор, дзе падлога цэмэнтная, і прыказываюць усім разувацца і стаяць босымі, ад чаго людзі застуджаюцца і хварэюць, а нават паміраюць, пры гэтым надзірацелі вельмі груба абходзяцца з вязьнямі.

3) 13-га лістапада 1924 г. зьявіўся ў камэру да палітычных старшы паліцыйны дазорца Ясінскі і загадаў Адамені П. і Шэставіцкаму М. ісьці з ім, завёў іх да магазына і патрэбаваў, каб яны ўраз-жа зьнялі пальто.

Вязьні заявілі, што польты іх уласныя, што цяпера зіма, і яны ня зьнімуць, ды прасілі паклікаць паліцыйнага інспэктара. Ясінскі не зьвярнуў на гэта ні якай увагі, клікнуў яшчэ дазорцаў Гванюка, Клепацкага і інш., і тыя сілай зьнялі з іх польты, а пасьля гэтага пазваў інспэктара Шэршова, які не разьбіраючы нічога, пасадзіў Адаменю і Шэставіцкага ў карцар.

4) 10-га сьнежня 1924 г. вязень Макарэвіч Міхола падмёў камэру і сьмяцьцё кінуў у „парашку", як заўсёды робяць. Але-ж гэта не спадабалася дазорцы Стасевічу, і той прыказаў Макарэвічу, каб ён рукамі выбраў сьмяцьцё з парашкі і занёс у клязэт.

Макарэвіч заявіў дазорцы, што ён занясе ў клязэт і выбярэ лапатаю, але-ж дазорца ўпёрся на тым, каб Макарэвіч выбраў рукамі і, калі той катэгарычна адмовіўся, дык дазорца напісаў рапарт да інспэктара Шэршова, які пасадзіў Макарэвіча на суткі ў карцар.

У знак пратэсту палітычныя вязьні аб'явілі галадоўку і папрасілі, каб прыйшоў інспэктар Шэршов. Але-ж інспэктар адказаў праз дазорцу, што ня лічыць патрэбным прыйсьці да іх для выясьненьня, і толькі на трэці дзень галадоўкі заявіўся да іх.

5) У 1922 г., калі арыштавалі беларусаў і літвіноў і пасадзілі іх у турму, дык кожны з іх прынёс з сабою грошы і здаў у канцэлярыю. Таксама грошы клалі бацькі арыштаваных на іх патрэбы. Не аднакроць кожны, хто палажыў грошы, хацеў рабіць сабе выпіску прадуктаў, але адміністрацыя вастрогу казала, што грошай яны ня маюць, цяпера, у 1924 г., калі маркі страцілі сваю вартасьць, дык канцэлярыя кожнаму выдала маркі на рукі.

Дзяга.

Беларусы у Латвії.

Мастацкая праца.

У Дзьвінску вучыцялі і вучні Беларускае Дзяржаўнае Гімназіі стварылі даволі паважны асяродак мастацкае працы, — асабліва прыймаючы пад увагу, што ў межах Латвійскае Рэспублікі жыве агулам каля 100,000 душ беларусаў.

Гэта — аматарскі тэатр і хор.

З рэпэртуару драматычнае дружыны трэба адзначыць такія п'есы, стаўленыя за апошнія часы ў Дзьвінску, Краслаўцы і Рызе — нават у Дзяржаўным Нацыянальным Тэатры: 1) Паўлінка, 2) Хам, 3) Чырвоны млын — апэрэткі ў 3-х актах, 4) Сягоньняшнія і даўнейшыя, 5) Пашыліся ў дурні, 6) Страхі жыцьця, 7) Птушка шчасьця, 8) На вёсцы, 9) Манька, 10) На Антокалі — дый цэлы рад адноактовак беларускіх аўтараў і перакладаных з іншых моваў. Дзьвінскія беларусы з гордасьцяй могуць сказаць, што іх пастаноўкі — зусім ня горшыя за віленскія ці — то менскія з 1917—18 г. г. Даволі сказаць, што выступленьне дзьвінскае дружыны на сцэне дзяржаўнага тэатру ў сталіцы аказалася на належный вышыні і сораму беларускаму мастацтву не зрабіла!

Хор складаецца з 35 асоб і мае ў сваім рэпэртуары больш за 50 песень на 4 галасы — пераважна народных, дый кампазіцыі Рагоўскага, Тэрраўскага, Шымкуса, Манюшкі і інш., а да таго 20 песень солёвых і дуэтаў Глінкі, Чайковскага, Грэчанінава, Манюшкі і др.

Душой усяе мастацкае працы ў Дзьвінску зьяўляецца вучыцелька Пауліна Мядзёлка, вядомая сваей многалетняй працай і ў Менску ды ў Вільні.

Падарожны.

Юрыдычныя парады.

1) Каапэратыву „Прыяцель".

Пытаньне: Які процант выплачаваць ад поўнай валёрызацыі за пазыкі, атрыманыя ў 1920—22 г. г.? Абязацельствы выданы не на тэрмін, а да першага запатрабаваньня.

Адказ: Калі пазыка была без залогу (напр. вэксаль або расьпіска), дык 10%, але суд мае права, уважаючы на матарыяльнае палажэньне даўжніка і крэдытара, прысудзіць і больш—аж да 100% (Rozporzgolzenie Prezydenta Rreczpospolitej z dn. 14 maja 1924 r. o przerachowaniu zobowiązań).

2) Раману Кунцэвічу.

Пытаньне: У мяне ёсьць вэксаль на 40 рублёў, расейскі з 1907 году. Па вэксалю плаціць адмаўляюцца. Ці магу сыскаць судом і сколькі? Вэксаль бестэрміновы.

Адказ: Вэксаль страціў сілу па даўнасьці ў 1913 годзе.

3) „Рогі".

Пытаньне: Купілі мы зямлю ў канцы 1913 г. Купчую рабілі ў 1915 г., але на рукі не дасталі, бо бралі банку 4,000 руб. Цяпер—у 1923 г.—былы ўласьнік падаў нас у суд, каб адабраць зямлю, але ў нас ёсьць невялічкія дакумэнты, і 9 сьведкаў прысягнулі, што мы купілі і валадаем зямлёю з 1913 году, ды што бралі банку 4.000 руб.—Што з гэтага можа выйсьці і што могуць прысудзіць за 4.000 руб. банку?

Адказ: Калі ёсьць хоць якія-небудзь дакумэнты аб прадажы, або квіты з банку, то зямлі не адбяруць. За 4.000 руб. могуць прысудзіць ад 1064 зл. да 10.640 зл.—залежыць ад суда. Калі гэныя 4.000 руб. банк ужо выплаціў прадаўцу, то прыдзецца плаціць толькі ў казну кожын год процанты.

4) М. Яс.

Пытаньне: Зямля 6 дзес. куплена ў 1909 г. на вечнае карыстаньне. Умова сцьверджана власною ўладаю. Цяпер прадавец, апіраючыся на апошні пункт яе: „калі я, ці мае насьледнікі пажадаюць адабраць гэту зямлю, то павінны заплаціць за ўдабрэньне зямлі і яе вартасьць", — хоча яе судом адабраць. За зямлю заплочана 650 руб. Ці можа прадавец цяпер па польскім законам адабраць зямлю?

Адказ: Па закону 2 ліпня 1924 г. („Dz. Ust." № 69/24, p. 669) можна прасіць Акружны суд, каб прызнаў зямлю на ўласнасьць; закон гэты маець сілу да 8 жніўня 1927 году. Калі прадавец падаў ужо на суд, то трэба заявіць узаемную позву. У такой справе трэба зьвярнуцца да адваката.

5) М. Савоту ў Лідчыне.

Адказ: Дэлегатура Ураду ў Вільні выдаець пропускі толькі ў Літву, а ў Латвію трэба браць заграничны пашпарт.

6) Васілю Вітко, у в. Ханевічы, Горадзенск. пав.

Адказ: Спраўкі можна атрымаць толькі ад польскага консула ў Канадзе, або ў канадзкага консула ў Польшчы.

7) Хаткевічу і др. ў фальв. Зосіна, Пастаўскае гм. Дунілавіцкага пав.

Адказ: Хаткевіч, можа, і маець якое права, але ў пісьме мала даных, каб можна было даць параду. Найлепей было-б, каб ён сам прыехаў у Вільню, бо пісьмом чаго трэба не напішаш.

АБВЕСТКІ

(За зьмест абвестак, якія зьмяшчаюцца пад гэтым загалоўкам Рэдакцыя адказнасьці на сябе не бярэ!).

Рэдактар-Выдавец Антон Прокапеня.

Друкарня Н. Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.